Прыёмная кампанія — 2020

УМОВЫ ЗАДАННЯЎ АДНОЛЬКАВЫЯ, ВАРЫЯНТЫ ДЛЯ ВЫБАРУ АДРОЗНІВАЮЦЦА

«Усе тэсты, якія прапануюцца падчас ЦТ, рэпетыцыйнага вочнага ці дыстанцыйнага тэсціравання, адпавядаюць праграмам уступных іспытаў, спецыфікацыі, а таксама зместу падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Таму структура тэстаў і ў першы, і ў другі дзень здачы ЦТ па рускай мове заставалася нязменная, ва ўсіх пазіцыях тэмы паўтараліся», — пра гэта паведаміла журналістам намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Наталля ВАЙЦЯХОВІЧ.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Нагадаем, што ўпершыню абітурыентаў, якія здаюць ЦТ па рускай мове і матэматыцы (гэта самыя масавыя дысцыпліны), па прычыне напружанай эпідэмічнай абстаноўкі падзялілі на два патокі — каб размясціць іх у аўдыторыях з захаваннем бяспечнай дыстанцыі. Таму яны праходзяць тэсціраванне з розніцай у адзін дзень. На думку асобных удзельнікаў ЦТ, абітурыенты, якія пісалі тэсты па рускай мове ў другі дзень, апынуліся ў больш выйгрышным становішчы, таму што сутнасць прапанаваных ім заданняў была ідэнтычная тым заданням, якія абітурыенты здавалі ў першы дзень. Пасля заканчэння ЦТ «першапраходцы» падзяліліся з сябрамі іх зместам, і тым, хто пайшоў здаваць на другі дзень, было прасцей сарыентавацца, настроіцца і падрыхтавацца да тэста. У іх заставаўся для гэтага час.

Наталля Вайцяховіч катэгарычна не згодная з такой пастаноўкай пытання.

— Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў планамерна рыхтуе абітурыентаў да ЦТ, — кажа яна. — І калі вы паглядзіце на змест рэпетыцыйнага тэсціравання, то ўбачыце, што і там пазіцыі, заяўленыя ва ўмовах задання, адпавядаюць зместу праграм уступных іспытаў. Прывяду толькі адзін прыклад. Адно з заданняў гучыць так: «Укажыце, у якіх словах часціца «не» пішацца асобна». І гэтую ж фармулёўку вы ўбачыце не толькі падчас ЦТ па рускай мове і ў першы, і ў другі дзень, але і ў рэпетыцыйным і дыстанцыйным тэсціраванні. Але варыянты, з якіх абітурыенты выбіраюць правільны, прапануюцца абсалютна розныя. Для рашэння такога, здавалася б, простага задання, як напісанне часціцы «не» ў словах, абітурыенту трэба ведаць дзевяць пазіцый (напісанне «не» з дзеясловамі, лічэбнікамі, прыслоўямі, прыметнікамі і гэтак далей. — **Аўт.**), пры гэтым ён павінен умець адрозніваць часціны мовы. Гэта ўсё комплексныя заданні, якія дазваляюць нам ацаніць не толькі цалкам выкананыя заданні, але і заданні, якія былі выкананыя часткова. Таму я хачу заспакоіць абітурыентаў: **так, умовы заданняў былі аднолькавыя, але прапанаваныя варыянты для выбару адрозніваліся, таму мы можам казаць, што былі створаны абсалютна роўныя ўмовы для абітурыентаў, якія здавалі тэсты і ў першы, і ў другі дзень.** Паўтораў у нас не было. Тэсты па матэматыцы ў першы і другі дзень таксама будуць адпавядаць спецыфікацыі і праграмам уступных іспытаў, таму ўсе ўдзельнікі ЦТ зноў акажуцца ў роўных умовах. Хачу заўважыць, што, абмяркоўваючы тэсты ў інтэрнэце, маладыя людзі проста марнуюць каштоўны час, які яны маглі б накіраваць на сваю падрыхтоўку.

ДАВЕДКА

Спецыфікацыя — гэта своеасаблівы алгарытм пабудовы тэста: яна вызначае яго структуру, колькасць заданняў па кожнай тэме і ўзровень іх складанасці. Распрацоўваецца на падставе Праграм уступных іспытаў у ВНУ і ССНУ на бягучы год. **На сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў можна знайсці спецыфікацыю тэстаў, якія давядзецца здаваць абітурыентам 2020 года.**

Кансультант упраўлення вышэйшай адукацыі галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэма ГЯРЛОЎСКАЯ паведаміла, што больш за пяць працэнтаў зарэгістраваных на ЦТ абітурыентаў не з'явіліся на першыя тры выпрабаванні. Чатыры чалавекі былі выдаленыя за выкарыстанне мабільных тэлефонаў, шэсць абітурыентаў змогуць прайсці ЦТ у рэзервовыя дні ў сувязі з тым, што прапусцілі выпрабаванні па медыцынскіх паказаннях.

Наталля Вайцяховіч звярнула ўвагу абітурыентаў на наступную акалічнасць: калі ў працэсе здачы ЦТ яны адчуюць сябе дрэнна, то павінны неадкладна паведаміць пра гэта арганізацыйнай камісіі ў экзаменацыйнай аўдыторыі. Ім акажуць медыцынскую дапамогу і па медыцынскіх паказаннях яны будуць мець права праходжання ЦТ у рэзервовы дзень Але сёлета ўжо былі звароты ад абітурыентаў праз тры-чатыры гадзіны пасля завяршэння экзамену. Тыя скардзіліся, што адчувалі сябе нядобра, разам з тым яны выканалі тэст у поўным аб'ёме, здалі свае матэрыялы і атрымалі ў пропуску пазнаку «Тэсціраванне прайшоў». Таму казаць пра іх допуск да пераздачы тэста ў рэзервовы дзень дастаткова праблематычна.

Рэма Гярлоўская паведаміла, што ўсяго на ЦТ сёлета зарэгістравалася больш за 64 тысяч чалавек, а на першую ступень вышэйшай адукацыі плануецца прыняць больш за 55 тысяч студэнтаў, у тым ліку на бюджэтныя месцы — каля 27 тысяч.

У параўнанні з папярэднім годам будзе павялічаны набор на медыцынскія, асобныя педагагічныя спецыяльнасці і спецыяльнасці, звязаныя з фізічнай культурай і спортам. Мэтавы набор павялічыцца на медыцынскія спецыяльнасці і спецыяльнасці, звязаныя з сельскай гаспадаркай. Згодна з указам Прэзідэнта, выпускнікі профільных аграрных класаў атрымалі сёлета права паступаць на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці без уступных выпрабаванняў, але на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі і пры наяўнасці ў атэстаце адзнак па профільных прадметах не ніжэй за 7 балаў. Як правіла, гэта фізіка, матэматыка, біялогія і хімія.

Акрамя таго, указам Прэзідэнта прадугледжана льготнае паступленне для асоб, якія прайшлі тэрміновую ваенную службу (службу ў рэзерве) і маюць рэкамендацыі воінскіх часцей. Гаворка ідзе пра тых, хто завяршыў службу ў год прыёму або ў папярэдні год. Такія маладыя людзі маюць права па-за конкурсам паступаць на завочную і вячэрнюю формы навучання для атрымання вышэйшай адукацыі. Але ім патрэбныя вынікі ўступных выпрабаванняў або ЦТ. Пры наяўнасці адзнак не ніжэй за 6 балаў і сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыі яны маюць таксама права па-за конкурсам паступаць на спецыяльнасці профілю «ахова здароўя».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Тэхналогія будучыні

РАСПЛАЦІЦЦА «НЕ МІРГАЮЧЫ» МОЖНА БУДЗЕ Ў ПАДЗЕМЦЫ

БЕЛАРУСБАНК СТВАРЫЎ СЭРВІС АПЛАТЫ ПРАЕЗДУ Ў МЕТРО З ДАПАМОГАЙ ТВАРУ

Зусім хутка не трэба будзе стаяць у чарзе па жэтон або шукаць у сумцы праязны. Самы буйны айчынны банк знайшоў спосаб сэканоміць час пасажыраў пры аплаце паездкі ў метро. Учора банк прэзентаваў інавацыйны праект «Глядзі і праходзь». Сэрвіс дазволіць ажыццявіць аўтэнтыфікацыю пасажыраў і аплату праезду ў рэжыме рэальнага часу.

«Штодня Мінскім метрапалітэнам карыстаюцца тысячы пасажыраў, выкарыстоўваючы пры аплаце жэтончыкі, тэлефоны, плацежныя карткі. Для таго каб зрабіць працэс больш зручным, мы распрацавалі новы прадукт для аплаты, які, спадзяёмся, ацэняць мінчане і госці сталіцы. Гэта магчымасць прыйсці, паглядзець на біяметрычны сканер і здзейсніць аплату праезду», — адзначыў на прэзентацыі праекта **выканаўчы дырэктар Беларусбанка Дзмітрый ГРЫШЧАНКАЎ.**

Спецыяльныя біяметрычныя тэрміналы плануецца ўстанавіць на кожнай станцыі метро. Каб зрабіць аплату, пасажыру трэба будзе спампаваць праграму «М-банкінг» Беларусбанка, выбраць укладку «Глядзі і праходзь» і перад паездкай сфатаграфаваць свой твар. Лічбавы вобраз захаваецца на серверы без самой фатаграфіі, і пры пераходзе праз тэрмінал біяметрычная сістэма счытае яго рысы, а з плацежнай карткі, прывязанай да М-банкінгу, спішуцца грашовыя сродкі за праезд. Прайсці праз турнікет з дапамогай новай тэхналогіі можна будзе не больш чым за дзве секунды.

Цяпер праграма тэсціруецца супрацоўнікамі банка і метрапалітэна. Біяметрычны тэрмінал для гэтага быў усталяваны на станцыі метро «Плошча Леніна».

Плануецца, што мінчане змогуць скарыстацца новым сэрвісам на дзвюх станцыях: «Плошча Леніна» і адной са станцый трэцяй лініі метро. Пасля гэтага на працягу паўгода будуць глядзець нюансы, водгукі карыстальнікаў. Стваральнікі разлічваюць, што пры ўдалым тэсціраванні сістэма зможа з'явіцца на ўсіх станцыях, растлумачыў **начальнік упраўлення лічбавай трансфармацыі Беларусбанка Віктар БЯЗРУКАЎ.** Паводле яго слоў, тэрмінал можа сканіраваць твар пры дрэннай асветленасці, павароце галавы і нават калі чалавек у медыцынскай масцы.

Сяргей КУРКАЧ.

Анонс

СТАРЫЯ ПАШТОЎКІ ВЯРТАЮЦЬ ДА ПАДЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Новыя выданні серыі «У пошуках страчанага»

1 ліпеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі а 16-й гадзіне адбудзецца прэзентацыя новых кніг вядомага ў краіне філакартыста Уладзіміра Ліхадзедава — «Блакада» і «75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне».

Праект «У пошуках страчанага», якім калекцыянер апякуецца ўжо болей за пятнаццаць гадоў, цяпер уключае звыш 20 філакартычных альбомаў. Кнігі, якія будуць прэзентаваны на пляцоўцы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны. Рэпрадукцыі старых паштовак расказваюць пра тыя ці іншыя мясціны Ленінграда — сённяшняга Санкт-Пецярбурга, пра блізкія ваколіцы горада на Няве. Пра тое, якімі былі розныя адрасы ў пярэдадзень вайны, а пасля і ў гады ліхалецця. Многія ілюстрацыі прысвечаны перапісцы, ліставанню жыхароў блакаднага горада, іх родзічаў. Чытаеш словы, выпісаныя сэрцамі людзей, — і адкрываеш для сябе новае аблічча гераічнай і драматычнай памяці.

Выданне «75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне» — яшчэ і збор рэпрадукцый старых плакатаў, што настройвалі людзей на перамогу, пераадольванне страху, стварэнне жывога, светлага настроя.

Прэзентацыя філакартычных выданняў — толькі адзін з элементаў выстаўкі «Вайна і мір. Беларусь памятае. Вяртанне», праекта, заснавальнікам якога поруч з НББ з'яўляецца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Сімвалічна, што адкрыццё выстаўкі адбываецца напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Усім гасцям прэзентацыі кніг, выстаўкі старых паштовак з калекцыі У. Ліхадзедава будуць уручаны рэпрынты паштовак. А таксама — копіі старых дарэвалюцыйных газет.

Алесь ПЯСЧАНСКІ.

2 ЛІПЕНЯ АДБУДЗЕЦЦА ФІНАЛ SOCIAL WEEKEND — 2020

Кампаніі і мецэнаты вызначаць найлепшыя сацыяльныя праекты беларусаў.

Гэта ўжо пятнаццаты сезон найбуйнейшага ў краіне конкурсу сацыяльных праектаў, арганізаванага фондам «Дабро» з мэтай адраснай падтрымкі бізнесам карысных для грамадскасці ініцыятыў. За сем гадоў існавання конкурсу ў ім паўдзельнічала звыш 3500 унікальных ідэй, скіраваных на паляпшэнне жыцця грамадства ў розных сферах. Сярод больш чым 300 ужо здзейсненых праектаў — арганізацыя пошукава-выратавальнага атрада «Анёл», адкрыццё стрыт-фуд-вуліцы ў Маладзечне, фестываль Мінскага планетарыя, рэабілітацыя пацыентаў пасля траўмаў і інсультаў з выкарыстаннем тэхналогій віртуальнай рэальнасці і іншыя.

Сёлета з 476 камандаў-канкурсантаў да фіналу дайшлі 17. У ліку найбольш цікавых прапаноў — стварэнне ў Магілёве дзіцячай школы па праграмаванні дронаў, «сабакакафэ» ў Пінску для таго, каб звесці беспрытульных жывёл з іх патэнцыйнымі гаспадарамі, мабільны пункт харчавання і тэрміновай дапамогі для бяздомных, праграма па расшыфроўцы лічбаў медыцынскіх аналізаў. Хто з іх стане пераможцам Social Weekend і ўладальнікам галоўнага прызу ў памеры больш чым 100 тысяч рублёў, стане вядома ўвечары 2 ліпеня. Прамую трансляцыю мерапрыемства будзе весці лічбавая платформа VOKA (пачатак эфіру — а 18-й гадзіне, прагляд бясплатны для ўсіх ахвотных, а пасля трансляцыі запіс будзе дасяжны на сайце voka.tv у рэжыме архіва).

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне міністру юстыцыі Рэспублікі Беларусь Сліжэўскаму Алегу Леанідавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.